# *§ 30–0. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі

БНР БЕЛНАЦКАМ
А. Р. ЧАРВЯКОЎ
Д. Ф. ЖЫЛУНОВІЧ
ССРБ ЛІТБЕЛ
РЫЖСКАЯ МІРНАЯ ДАМОВА
ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЯ ВАЙНА

**1. Гістарычныя ўмовы стварэння беларускай дзяржавы.** Пасля разгону Усебеларускага з'езда частка яго дэлегатаў стварыла Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда.

У сувязі з пагрозай наступу германскіх войскаў кіраўнікі Аблвыканкамзаха пакінулі Мінск. У гэтых умовах Выканаўчы камітэт Рады 21 лютага 1918 г. абвясціў сябе вышэйшай уладай на тэрыторыі Беларусі. 9 сакавіка 1918 г. была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка (БНР). Аднак германскія акупацыйныя ўлады не бралі пад увагу заявы Рады. Дзеючых кіроўных органаў на месцах урад (Народны сакратарыят) БНР сфарміраваць не змог. Перамовы з кіраўніцтвам Германіі і адносіны з акупацыйнымі войскамі толькі кампраметавалі БНР.

**Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі**

Сучасныя гісторыкі называюць БНР «дзяржавай на паперы». Як вы лічыце, чаму БНР атрымала такую назву?

У германскіх войсках беларусы бачылі прыгнятальнікаў і ворагаў, якія неслі голад і разбурэнні. 3-я Устаўная грамата, якая абвяшчала незалежнасць БНР, сваёй мэты (міжнароднага прызнання) не дасягнула.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

25 красавіка 1918 г. з ініцыятывы Р. Скірмунта на імя кайзера Германіі Вільгельма II Радай БНР была накіравана тэлеграма:

«Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, як выбраная прадстаўніца беларускага народу, зварачаецца да Вашай Імператарскай Вялікасці з словамі глыбокай падзякі за вызваленне Беларусі нямецкімі войскамі з цяжкага ўціску, чужога пануючага здзеку і анархіі.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі дэкляравала незалежнасць цэлай і непадзельнай Беларусі і просіць Вашую Імператарскую Вялікасць аб абароне ў яе кіраваннях дзеля ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і непадзельнасці краю ў сувязі з Германскай Імперыяй.

Толькі пад абаронай Германскай Імперыі бачыць край сваю добрую долю ў будучыні.

*Прэзыдэнт Рады — Іван Серада,*
*Прэзыдэнт Сакратарыяту — Язэп Варонка,*
*Сябры Рады — Раман фон-Скірмунт, Антон Аўсянік,*
*Паўлюк Аляксюк, Пётра Крачэўскі, Язэп Лёсік».*

*Дайце сваю ацэнку гэтаму дзеянню Рады БНР.*



*А. Р. Чарвякоў*

### Утварэнне Беларускага нацыянальнага камісарыята

Вызваленне Беларусі ад германскіх войскаў і аднаўленне Савецкай улады пацягнулі за сабой узмацненне руху за *нацыянальнае самавызначэнне*.

Ініцыятыва ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць перайшла да той часткі ўдзельнікаў Усебеларускага з’езда, якія захавалі трывалыя кантакты з урадам Савецкай Расіі. Яшчэ 31 студзеня 1918 г. У. І. Ленін падпісаў дэкрэт аб стварэнні *Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкам)* на правах аддзела Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР, які ўзначаліў **А. Р. Чарвякоў**. Белнацкам зрабіўся галоўным цэнтрам, які змагаўся за станаўленне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.

**2. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).** Важным для лёсу савецкай беларускай дзяржаўнасці быў знешні фактар. Пасля набыцця Польшчай незалежнасці ўзніклі прэтэнзіі польскай дзяржавы на этнічныя землі Беларусі.

Узгадайце, якімі былі прэтэнзіі Польшчы на этнічныя землі Беларусі.

**30 снежня 1918 г.** у Смаленску была склікана VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая абвясціла сябе І з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б).

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Пастаноў VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б)**

Беручы пад увагу, што на чарговай VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП (бальшавікоў) прадстаўлены цалкам усе камуністычныя арганізацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, Канферэнцыя абвяшчае сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларускай рэспублікі.

...VI абласная канферэнцыя бальшавікоў лічыць неабходным абвясціць самастойную сацыялістычную рэспубліку Беларусь з тэрыторый Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў.

1. *Якія рашэнні былі прынятыя на VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б)?*
2. *Якія тэрыторыі, на думку ўдзельнікаў канферэнцыі, мелі ўваходзіць у склад беларускай дзяржавы?*
3. *Як вы лічыце, чым кіраваліся ўдзельнікі канферэнцыі, калі вызначалі менавіта гэтыя тэрыторыі ў склад беларускай дзяржавы?*

**Абвяшчэнне ССРБ**

**1 студзеня 1919 г.** быў апублікаваны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі аб утварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. У склад ССРБ увайшлі тэрыторыі Мінскай, Гродзенскай, Віцебскай, Магілёўскай, а таксама часткі Смаленскай, Віленскай, Ковенскай і Чарнігаўскай губерняў.

Назавіце прычыны стварэння ССРБ.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ


Працоўны народ усіх краёў злучайся!

МАНІХВЭСТ

Часоваго Работніча-Селянскаго Савецкаго Правіцяльства Беларусі.

Таварышы і браты рабочыя, бедныя селяне і чырвонаармейцы Беларусі!

НЕХАЙ ЖЫВЕ ВОЛЬНАЯ ПРАЦОЎНАЯ БЕЛАРУСЬ!
НЕХАЙ ЖЫВЕ САВЕЦКАЯ РАСЕЯ!
НЕХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ ПРАЦАЎНІЧАЯ РАВАЛЮЦЫЯ!

Імям вольнаго Беларускаго народу:

Старшыня Часоваго-Работніча-Селянскаго Правіцяльства Беларусі Зьмітро Жылуновіч.

Сябры правіцяльства: А. Мяснікоў, І. С. Иванов,
Алесь Чэрвякоў, И. Рейнгольд.

### З Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі

Таварышы і браты рабочыя, бедныя сяляне і чырвонаармейцы Беларусі!

<...> Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі... заклала падмурак новага ўкладу жыцця з уладай працоўнага народа. Пачаўшыся з Расіі, яна запаліла таксама агонь сусветнага вызвалення працоўнага народа ад эксплуатацыі...

<...> Сярод працоўных народаў Расіі, Літвы, Украіны і Латвіі ад сённяшняга дня рабіцеся і вы вольнымі і паўнапраўнымі гаспадарамі свабоднай незалежнай Беларускай сацыялістычнай рэспублікі. Ад сённяшняга дня Беларусь — Савецкая Рэспубліка — робіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты, чырвонаармейцаў Беларусі.

Часовы Рабоча-Сялянскі ўрад... абвяшчае ўсяму свету: ад гэтага моманту ўся ўлада ў Беларусі належыць толькі Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

1. *Якая падзея была гістарычнай перадумовай абвяшчэння ССРБ?*
2. *Чаму беларуская дзяржава называлася савецкай? Свой адказ падмацуйце цытатай з прадстаўленай крыніцы.*

### I Усебеларускі з'езд Саветаў

Для заканчэння працэсу дзяржаўнага будаўніцтва было вырашана склікаць *Усебеларускі з'езд Саветаў*. Нягледзячы на пратэсты беларускага партыйнага і савецкага кіраўніцтва, ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аддзяліць ад ССРБ Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую губерні і перадаць іх РСФСР. На I Усебеларускім з'ездзе Саветаў, які прайшоў 2–3 лютага 1919 г., старшыня УЦВК і сакратар ЦК РКП(б) Я. М. Свярдлоў зачытаў пастанову УЦВК РСФСР аб прызнанні незалежнасці ССРБ у змененых межах. З'езд прыняў Канстытуцыю ССРБ, дэкларацыю аб усталяванні федэратыўных сувязей з РСФСР.



*Дэлегаты І Усебеларускага з'езда Саветаў. Мінск, 2–3 лютага 1919 г.*

**Канстытуцыя ССРБ**

Канстытуцыя ССРБ уключала ўсяго 32 артыкулы. У якасці прэамбулы выступала «Дэкларацыя правоў працоўных і эксплуатаванага народа». Канстытуцыя 1919 г. замацоўвала найважнейшыя палажэнні новай дзяржавы: вышэйшыя органы ўлады (з'езд Саветаў, ЦВК, Прэзідыум ЦВК), асноўныя правы і абавязкі грамадзян, *герб* і *сцяг ССРБ* і г. д.

**Стварэнне ЛітБел**

На І Усебеларускім з'ездзе Саветаў было таксама прынятае рашэнне аб аб'яднанні Савецкіх Сацыялістычных рэспублік Літвы і Беларусі ў адну дзяржаву — Літоўска-Беларускую Рэспубліку (ЛітБел).

**Перадумовы стварэння ЛітБел**

**3. Стварэнне Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.** Ідэя стварэння літоўска-беларускай дзяржавы ўзнікла яшчэ ў 1918 г. Пры гэтым прымаліся пад увагу агульнасць гістарычных лёсаў Літвы і Беларусі, а таксама ўмацаванне іх абараназдольнасці. Горад Вільня сваім эканамічным уплывам ахопліваў значную частку Беларусі, прыцягваў да сябе беларускія нацыянальна-культурныя сілы. Да стварэння літоўска-беларускай дзяржавы падштурхоўвала сітуацыя ў Польшчы, дзе панавала

ідэя аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Савецкі камуністычны ўрад імкнуўся супрацьпаставіць гэтаму саюз савецкіх рэспублік Літвы і Беларусі.

### Стварэнне ЛітБел

На пасяджэнні ў Вільні 27 лютага 1919 г. ЦВК Літвы і ЦВК Беларусі былі аб'яднаныя. Афіцыйная назва дзяржавы, зацверджаная Саветам Народных Камісараў 2 сакавіка 1919 г.: *Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі*; у афіцыйных дакументах распаўсюджанне атрымала скарочаная форма — ЛітБел. Тэрыторыя ЛітБел першапачаткова ахоплівала Віленскую і Мінскую губерні, а таксама частку Ковенскай і Гродзенскай губерняў.

### Адносіны з Польшчай

Урад РСФСР прызнаў Польскую рэспубліку як суверэнны суб'ект міжнародных адносін і неаднаразова прапаноўваў абмяняцца дыпламатычнымі прадстаўнікамі. Савецкае кіраўніцтва імкнулася пазбягаць ваеннай канфрантацыі, у чым, безумоўна, не былі зацікаўлены кіруючыя колы Польшчы і яе заходнія саюзнікі. Міралюбныя прапановы ўтрымоўвала і Дэкларацыя ЦВК ЛітБел ад 28 лютага 1919 г. са зваротам да ўсіх народаў, усіх урадаў. Гэта быў першы знешнепалітычны дакумент аб'яднанай рэспублікі. Але польскі сейм адхіліў прапанову аб правядзенні плебісцытаў у мясцовасцях, спрэчных па нацыянальным складзе насельніцтва, і не прызнаў урад ЛітБел у якасці законнага прадстаўніка сваіх народаў.

Польскае камандаванне імкнулася як мага больш эфектыўна выкарыстоўваць выгадную для сябе сітуацыю, калі галоўныя сілы Чырвонай арміі былі кінутыя супраць А. В. Калчака і задзейнічаны на Усходнім фронце. Заходні фронт па гэтай прычыне не змог атрымаць неабходныя людскія і матэрыяльныя рэсурсы. Складанай заставалася і ўнутрыпалітычная абстаноўка на тэрыторыі абвешчанай рэспублікі. Палітыка «ваеннага камунізму» не была прынятая сялянствам Беларусі і Літвы. Па гэтай

прычыне яго супраціўленне набыло крайнія формы: паўстанняў і бунту. Вельмі важным фактарам стала змяненне палітыкі бальшавікоў у дачыненні да серадняка ў сакавіку 1919 г. Аднак час ужо быў упушчаны. 19–21 красавіка 1919 г. польскія войскі захапілі Вільню. Нягледзячы на жорсткія ўказанні У. І. Леніна, вярнуць сталіцу ЛітБел Чырвоная армія не змагла.

Скасаванне ЛітБел

І. В. Сталін, які прыбыў у Мінск у сярэдзіне ліпеня 1919 г., запатрабаваў распусціць цэнтральныя органы ЛітБел у сувязі з «поўнай непатрэбнасцю ўрада». 19 ліпеня СНК ЛітБел сабраўся на сваё апошняе пасяджэнне, на якім заявіў аб спыненні сваёй дзейнасці. Услед за гэтым Мінскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт пастанавіў, што прымае на сябе ўсю паўнату адказнасці за сітуацыю на тэрыторыях, якія раней кантраляваліся ЛітБел. Штучна створаная Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі знікла, так фактычна і не прыступіўшы да сур'ёзнага дзяржаўнага будаўніцтва, нават не выканаўшы той знешнепалітычнай місіі, якую ўскладалі на яе бальшавікі.

Пачатак вайны

**4. Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг.** Польскі ўрад на чале з Ю. Пілсудскім намагаўся аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. За кароткі тэрмін Польшча пры падтрымцы краін *Антанты* стварыла магутную армію і ў лютым 1919 г. пачала захоп этнічнай беларускай тэрыторыі.

Вайна разгарнулася на фоне Грамадзянскай вайны ў Расіі. У 1919 г. польскія войскі занялі значную частку Заходняй Беларусі. Фронт стабілізаваўся да вясны 1920 г. па лініі ракі Бярэзіны. На захопленых тэрыторыях польскія ўлады ўсталявалі жорсткі *акупацыйны рэжым*, падаўлялі мясцовы нацыянальны рух і праводзілі *рэквізіцыі*. Барацьбой партызан на акупаванай польскімі войскамі тэрыторыі Беларусі кіравалі бальшавікі і партыя беларускіх эсэраў. Яшчэ адной сілай супраціўлення




● **МІНСК** Сталіцы дзяржаў (на 1921 г.)
◎ Віцебск Цэнтры губерняў, ваяводстваў
○ Полацк Іншыя населеныя пункты

ГРАНІЦЫ

- дзяржаў на 14 жніўня 1920 г. (усходняя мяжа Польшчы дадзена па «лініі Керзана»)
- Літоўска-Беларускай ССР
- «лініі Керзана» (усходняя граніца Польшчы, якая была прапанавана Антантай 8 снежня 1919 г.)
- сучаснай Рэспублікі Беларусь
- Лінія Заходняга фронту ў канцы лютага 1919 г.
- Лінія польска-савецкага фронту ў чэрвені 1920 г.
- Лінія польска-савецкага фронту на 14 жніўня 1920 г.

ТЭРЫТОРЫІ

- Літоўска-Беларускай ССР, якія кантраляваліся савецкім урадам у чэрвені 1920 г.
- ССРБ пасля другога абвяшчэння
- акупаваныя польскімі войскамі на момант завяршэння ваенных дзеянняў (кастрычнік 1920 г.)

- Наступ польскіх войскаў у 1919 – першай палове 1920 г.
- Наступ Чырвонай арміі ў чэрвені–жніўні 1920 г.
- Контрудары польскіх войскаў 16–25 жніўня 1920 г.
- Адступленне войскаў Чырвонай арміі пасля паражэння пад Варшавай
- Другое абвяшчэнне ССРБ 31 ліпеня 1920 г.

*Польска-савецкая вайна 1919–1921 гг.*

была Беларуская Камуністычная арганізацыя (БКА) на чале з У. Ігнатоўскім, якая адкалолася ад партыі беларускіх эсэраў і мела за мэту адраджэнне Савецкай улады ў Беларусі. Для барацьбы з польскай інтэрвенцыяй бальшавікі стварылі Заходні фронт.

**Контрнаступ Чырвонай арміі**

Увесну 1920 г. пачаўся новы наступ войскаў Польшчы. Але да гэтага часу былі пераможаны генералы Калчак і Дзянікін. Савецкае кіраўніцтва перакінула частку сіл, у тым ліку Першую конную армію С. Будзённага, на адпор палякам. Заходні фронт узначаліў М. Тухачэўскі. Увесну 1920 г., калі польскія войскі наступалі на Палессе, пачаўся контрнаступ Чырвонай арміі. 11 ліпеня 1920 г. быў вызвалены Мінск, затым Вільня, Гродна і Брэст.

**Дэкларацыя аб абвяшчэнні ССРБ**

З'явілася рэальная магчымасць аднавіць беларускую дзяржаву. **31 ліпеня 1920 г.** апублікаваная «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі» (ССРБ). Беларусь набывала міжнародную правасуб'ектнасць і магла ўдзельнічаць ва ўсіх міжнародных перамовах, у тым ліку наконт аднаўлення сваёй тэрытарыяльнай цэласнасці.

**Контрнаступ польскай арміі**

Вайна перайшла на тэрыторыю Польшчы. Аднак пасля паражэння ў Варшаўскай бітве, знаходзячыся пад пагрозай акружэння, войскі Чырвонай арміі вымушаны былі з вялікімі стратамі адступіць не толькі з тэрыторыі Польшчы, але і з Заходняй Беларусі.

**Пачатак перамоў**


*Падпісанне Рыжскай мірнай дамовы*

**5. Рыжская мірная дамова.** Ва ўмовах наступу польскіх войскаў савецкі ўрад пагадзіўся на перамовы, якія праходзілі ад сярэдзіны жніўня 1920 г. у Мінску і працягнуліся ў Рызе. У Рыгу выехаў старшыня Саўнаркама ССРБ А. Р. Чарвякоў. Польская дэлегацыя не прызнала яго паўнамоцтваў. Лёс Беларусі вырашаўся без беларусаў.

Перамовы з польскім бокам вяла расійска-ўкраінская дэлегацыя. **18 сакавіка 1921 г.** у Рызе была

падпісана мірная дамова. Паводле яе да Польшчы адышла заходняя частка Беларусі агульнай плошчай 110 тыс. км$^2$. Беларускі народ быў падзелены на працягу двух дзесяцігоддзяў. ССРБ як дзяржава працягвала сваё існаванне толькі на тэрыторыі шасці паветаў былой Мінскай губерні.

Вынікі Рыжскай мірнай дамовы

**6. Удзел ССРБ ва ўтварэнні СССР.** Першыя гады пасля Грамадзянскай вайны паказалі, што для паспяховага аднаўлення гаспадаркі, супрацьстаяння капіталістычнаму акружэнню неабходна аб'яднаць сілы ўсіх савецкіх рэспублік. Заключаных раней ваенна-палітычнай (1919 г.) і ваенна-эканамічнай (1921 г.) дамоў было недастаткова. На парадак дня было пастаўлена пытанне наконт стварэння адзінай дзяржавы.

Перадумовы аб'яднання савецкіх рэспублік

Стварэнне СССР

IV Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся **18 снежня 1922 г.**, ухваліў *ленінскі план стварэння Саюза ССР* і падтрымаў уваходжанне Беларусі ў яго склад. Пасля стварэння СССР за нашай рэспублікай замацавалася назва — Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР).

Узбуйненні БССР

Уваходжанне БССР у склад СССР мела важнае значэнне для нашай рэспублікі. Яно паспрыяла эканамічнаму і культурнаму развіццю БССР. З уваходжаннем БССР у склад СССР звязана і вырашэнне пытання аб узбуйненні тэрыторыі рэспублікі. Аб'яднанне рэспублік у складзе СССР выступіла таксама важным фактарам Перамогі над нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**7. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.** У 1921 г. пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора тэрыторыя ССРБ складала толькі шэсць паветаў Мінскай губерні. Пасля падпісання Дамовы аб стварэнні СССР у склад БССР былі вернуты этнічныя ўсходнебеларускія тэрыторыі. Гэта адбывалася ў **1924** і **1926 гг.**

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ




*Фарміраванне тэрыторыі БССР у 1921–1926 гг.*

1. *Якая была тэрыторыя ССРБ пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора?*
2. *Як змянілася тэрыторыя БССР у 1924 і 1926 гг.?*
3. *У якім годзе і ў выніку якіх падзей Заходняя Беларусь была ўз'яднана з БССР?*

### БССР пасля ўз'яднання з Заходняй Беларуссю

У выніку вызваленчага паходу Чырвонай Арміі, што пачаўся 17 верасня 1939 г., Заходняя Беларусь уз'ядналася з БССР. Тэрыторыя рэспублікі павялічылася ўдвая, да 225,7 тыс. км$^2$. Колькасць насельніцтва вырасла прыблізна ў два разы і напрыканцы 1940 г. склала больш за 10 млн чалавек.

У **1927 г.** VIII Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў новую Канстытуцыю БССР. У ёй БССР абвяшчалася дзяржавай дыктатуры пралетарыяту, у якой уся ўлада належыць Саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Замацоўвалася

ўваходжанне БССР у СССР з правам свабоднага выхаду з Саюза. БССР мела права прымаць сваю Канстытуцыю, уносіць у яе змены, ствараць органы дзяржаўнай улады.

Змены, якія адбыліся ў рэспубліцы ў 1930-я гг., былі замацаваныя ў Канстытуцыі БССР **1937 г.** У ёй адзначалася, што БССР з'яўляецца *сацыялістычнай* дзяржавай рабочых і сялян. Палітычную аснову БССР, згодна з Канстытуцыяй, складалі Саветы дэпутатаў працоўных, эканамічную аснову — сацыялістычная ўласнасць у дзвюх формах: дзяржаўнай і калгасна-кааператыўнай.

Канстытуцыя 1919 г.

**8. Канстытуцыйнае будаўніцтва, органы ўлады і кіравання БССР у міжваенны перыяд.** Першая Канстытуцыя ССРБ была адобрана I Усебеларускім з'ездам саветаў у лютым 1919 г. У сувязі з меркаваным стварэннем ЛітБел яна не ўтрымоўвала многіх важных канстытуцыйных нормаў (аб выбарчым праве, аб мясцовых органах улады і кіравання, аб бюджэтным праве).

Канстытуцыя 1927 г.

Канстытуцыя СССР 1924 г. вызначала структуру вышэйшых органаў агульнасаюзнай улады і кіравання, іх кампетэнцыю, аднак не закранала асноў эканамічнага і палітычнага ладу саюзных рэспублік. Другая Канстытуцыя БССР, якая была актуалізавана ўтварэннем СССР, распрацоўвалася на працягу некалькіх гадоў. Першы яе праект, прадстаўлены ў лютым 1925 г., не быў зацверджаны. Пасля дапрацоўкі ў 1927 г. Канстытуцыя БССР юрыдычна аформіла добраахвотнае і свабоднае ўваходжанне БССР у склад СССР, адлюстравала пашырэнне сацыяльнай асновы Савецкай дзяржавы. Асноўная рыса Канстытуцыі БССР 1927 г. — размежаванне функцый дзяржаўных органаў: з'езда саветаў і ЦВК БССР. Канстытуцыя замацавала за рэспублікай права свабоднага выхаду з Саюза.

Канстытуцыя 1937 г.

У 1936 г. была зацверджана другая Канстытуцыя СССР, якая ўстанавіла аднастайнасць дзяржаўна-прававых нормаў на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза. На яе аснове ў 1937 г. была прынята трэцяя Канстытуцыя БССР. Кампетэнцыя заканадаўчых і выканаўчых органаў БССР была значна звужана. Канстытуцыя БССР 1937 г. дзейнічала да 1978 г.

Эвалюцыя органаў дзяржаўнай улады

На працягу 1921–1939 гг. значную эвалюцыю зведалі органы дзяржаўнай улады Савецкай Беларусі. У адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1919 г. вярхоўная ўлада ў рэспубліцы належала з'езду Саветаў, а ў перыяд паміж з'ездамі — Цэнтральнаму выканаўчаму камітэту (ЦВК). У адпаведнасці з прынятай 3 лютага 1919 г. І з'ездам Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Канстытуцыяй БССР выкананне функцый урада ўскладалася на Малы і Вялікі Прэзідыумы ЦВК БССР. Савет Народных Камісараў (СНК) фарміраваўся на падставе рашэнняў ІІ з'езда Саветаў (13–17 снежня 1920 г.), якi прыняў дадатак да Канстытуцыі ССР Беларусі. СНК надзяляўся правам і выдаваць указы, распараджэнні, інструкцыі, прымаць усе меры, неабходныя для паўсядзённага кіравання. Старшыня СНК адначасова з'яўляўся старшынёй ЦВК. Члены СНК узначальвалі органы галіновага кіравання — народныя камісарыяты. Уз'яднанне ўсходняй часткі Беларусі з Савецкай Беларуссю ў 1924 г. прывяло да размежавання апарату ЦВК і СНК БССР. Канстытуцыя 1927 г. вызначала, што пытанні аб зменах тэрыторыі рэспублікі павінны разглядацца толькі на з'ездах Саветаў. Адмянялася права СНК ў неадкладных выпадках самастойна выдаваць заканадаўчыя акты. Абмежаванне кампетэнцыі СНК ператварыла яго ў выключна выканаўчы дзяржаўны орган, падсправаздачны ЦВК.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1936 г. і Канстытуцыяй БССР 1937 г. з’езды Саветаў спынілі сваё існаванне, замест іх і ЦВК стварaўся вышэйшы орган дзяржаўнай улады — Вярхоўны Савет.

Вярхоўны Савет абіраўся тэрмінам на 4 гады і дзейнічаў на аснове Канстытуцый БССР і СССР. У перыяд паміж сесіямі Вярхоўнага Савета працаваў яго Прэзідыум.

*Беларуская дзяржава прайшла складаны шлях свайго станаўлення. Абвешчаная БНР рэальнай дзяржавай не з'яўлялася, бо цалкам падпарадкоўвалася нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў і аднаўленне Савецкай улады стварылі ўмовы для рэалізацыі права беларускага народа на нацыянальнае самавызначэнне, вынікам якога стала ўтварэнне ССРБ.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1921–1922 гг. — Вашынгтонская канферэнцыя | 1921 г. — падпісанне Рыжскай мірнай дамовы |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якім чынам беларускі народ рэалізаваў сваё права на самавызначэнне? Што азначае выраз «стварэнне беларускай дзяржавы на савецкай аснове»?
2. Назавіце перадумовы стварэння ССРБ. Дайце ацэнку гэтай гістарычнай падзеі.
3. Вызначце прычыны стварэння ЛітБел. Чаму гэтая дзяржава была скасавана неўзабаве пасля ўтварэння?
4. Ахарактарызуйце асноўныя этапы польска-савецкай вайны. Як змянілася тэрыторыя ССРБ у выніку Рыжскай мірнай дамовы?
5. Якое гістарычнае значэнне для БССР мела ўваходжанне ў склад СССР? Ці згодныя вы з тым, што ўтварэнне СССР адпавядала геапалітычным інтарэсам БССР?
6. Ахарактарызуйце змяненні тэрыторыі Беларусі ў 1921–1939 гг. Вызначце прычыны і вынікі гэтых змяненняў.
7. Назавіце вышэйшыя органы дзяржаўнай улады БССР. Вызначце, як змяняліся іх паўнамоцтвы ў міжваенны перыяд. Вылучыце фактары, якія на гэта ўплывалі.